Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 10 (701) ● Пятніца 15 сакавіка 1968 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXI

УЗНАГАРОДЫ ЎРУЧАНЫ

Днямі ў Акадэміі навук СССР былі ўручаны залатыя медалі і прэміі імя выдатных вучоных. Сярод узнагароджаных беларускія вучоныя — акадэмікі Б. І. Сцяпанаў і Т. Н. Годнеў. Б. І. Сцяпанаву ўручана залатая медаль імя С. І. Вавілава за сукупнасць навуковых прац па тэорыі люмінісцэнцыі складаных малекул, а Т. Н. Годневу — прэмія імя К. А. Ціміразева за манаграфію «Хларафіл, яго пабудова і ўтварэнне ў расліне». З паведамленнем аб іх навуковых працах выступіў вучоны сакратар прэзідыума Акадэміі навук СССР акадэмік Я. В. Пейве. Цёпла павіншаваў узнагароджаных і пажадаў ім далейшых поспехаў у развіцці савецкай навукі прэзідэнт Акадэміі навук СССР М. В. Келдыш.

ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

● Калектыў універсітэта радасна адзначыў Міжнародны жаночы дзень 8 Сакавіка.

На ўрачыстым пасяджэнні ў тэатры оперы і балета жанчын цёпла віталі прарэктар прафесар Л. В. Валадзько, прафесар М. Р. Ларчанка і паэт Н. С. Гілевіч.

● У сувязі з 65-годдзем з дня нараджэння загадчыка кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі, члена-карэспандэнта АН БССР, прафесара Васіля Іванавіча Сцяпанава ў навуковай чытальнай зале бібліятэкі адкрылася выстаўка яго прац.

● Два дні працягвалася студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння А. М. Горкага. З дакладамі выступіла 10 чалавек.

Сёння дэлегацыя нашага універсітэта ў складзе студэнтаў Г. Шмыгінай, С. Саладоўнікава, Б. Плотнікава, Т. Баганік на чале з аспірантам Д. Фёдаравым выехала ў ГДР для ўдзелу ў горкаўскіх урачыстасцях у Іенскім універсітэце.

● Выйшла з друку кніга дацэнта кафедры сістэматыкі раслін З. Н. Кудрашовай «Мікалогія з асновамі фітапаталогіі». Яна прадстаўляе вялікую цікавасць для спецыялістаў сельскай гаспадаркі, аматараў прыроды. У ёй змяшчаюцца звесткі не толькі пазнавальнага характару, але і тыя, што маюць практычнае значэнне.

Гэта ў сваім родзе ўнікальная праца з'яўляецца новай ступенню ў развіцці мікалогіі і цудоўным дапаможнікам для нашых студэнтаў.



Фотаінфармацыя

Студэнты трэцяга курса факультэта журналістыкі вывучаюць гісторыю замежнага друку. На практычных занятках той, хто дасканала ведае замежную мову, выступае перад аўдыторыяй з аглядам прачытанага. Ужо праведзены агляды польскага, румынскага і англійскага друку.

На здымку (уверсе): студэнт В. Тарасевіч выказвае свае меркаванні па англійскаму друку.

Стажор-даследчык кафедры радыётэхнічнай і фізічнай электронікі Э. Я. Радоўскі і тэхнік В. Л. Будай даследуюць фотаэлектрычныя ўласцівасці (здымак справа).

Кожная хвіліна вучэбнага часу хавае ў сабе напружаную працу думкі, радасць пазнання, задавальненне ад дасягнутай перамогі.

Дошка стракатая ад формул: ідуць практычныя заняткі па біяхіміі раслін на II курсе біяфака. На момант задумалася Валя Паліксёнава.

Фота І. Аскіркі.

ПАРТКОМ АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

Набліжаюцца знамянальныя дні ў жыцці беларускага і ўсяго савецкага народа — 50-годдзе БССР, Кампартыі Беларусі і 50-годдзе ВЛКСМ. Пад дэвізам падрыхтоўкі да гэтых слаўных дат, а таксама да 150-годдзя з дня нараджэння К. Маркса і 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна ва універсітэце арганізуецца агляд-конкурс студэнцкага насценнага друку. Ён будзе праходзіць у два туры: першы — да 5 мая 1968 года, другі — да 1 студзеня 1969 года. Палажэнне аб аглядзе днямі зацверджана партыйным камітэтам.

МЭТА АГЛЯДУ: павысіць ролю насценнага друку універсітэта ў вучэбна - выхаваўчай, навукова - даследчай і культурна - масавай рабоце, ператварыць яго ў яшчэ больш актыўнага памочніка партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый у падрыхтоўцы ідэйна загартаваных, высокакваліфікаваных спецыялістаў для розных галін вытворчасці і культурных устаноў нашай Радзімы, актыўных будаўнікоў камунізма.

УМОВЫ:

У аглядзе - конкурсе могуць прыняць удзел усе насценныя газеты універсітэта: факультэтаў, курсаў і груп, студэнцкіх саветаў, навуковага таварыства, адміністрацыйна - гаспадарчай часткі і іншых грамадскіх арганізацый.

Для ўдзелу ў аглядзе прадстаўляецца не менш пяці штомесячных нумароў, якія выйшлі на працягу 1967—1968 навучальнага года.

Парадак прадстаўлення: лепшыя нумары газет абмяркоўваюцца партыйнымі, камсамольскімі і прафсаюзнымі арганізацыямі факультэтаў з удзелам дэканатаў, затым не пазней 20 красавіка (для першага тура) і 10 снежня (для другога) здаюцца ў рэдакцыю газеты «Беларускі універсітэт» для абмеркавання членамі журы і не пазней 1 мая (для другога тура да 15 снежня) вывешваюцца на агульны агляд.

Для падвядзення вынікаў конкурса другога тура прадстаўляюцца нумары, якія выйшлі ў верасні-снежні, а таксама будуць улічвацца і вынікі першага тура.

Пры падвядзенні вынікаў будуць улічвацца разнастайнасць тэматыкі, жанраў; змест і ідэйны ўзровень матэрыялаў; аператыўнасць падачы іх; перыядычнасць выданняў; дзейснасць выступленняў; мова і стыль; найбольш выгаднае размяшчэнне матэрыялаў у нумары; мастацкае афармленне.

Партком зацвердзіў журы конкурсу ў складзе:

БУЛАЦКІ Р. В. — старшыня;
ІОСЬКА М. І. — намеснік старшыні;
ЦІКОЦКІ М. Я. — журфак;
ТКАЧОЎ П. І. — філфак;
СЕРАФІМОВІЧ А. І.— фізфак;
ДЗЯРБІНСКІ І. — хімфак;
БАРУШКА В. А. — геолага-геаграфічны;
ШУКАНАЎ А. С. — біяфак;
ЗАГАРУЛЬСКІ Э. М. — гістфак;
ГАРБАР М. А. — юрфак;
БАГДАНАВА Т. П. — матфак;
ЛАПІЧ А. А. — падрыхтоўчы факультэт;
ПАБОКА П. М. — партком;
РЫДКІ В. — камітэт камсамола;
КАРАБАНЬ І. А. — мясцком;
ЛАБАЧОВА М. І. — адміністрацыйна - гаспадарчая частка;
ШЫНГІРЭЙ А. — прафком.

Лепшым газетам адпаведна прысуджаецца першае, другое, трэцяе месцы. Рэдкалегіі газет-пераможцаў узнагароджваюцца граматамі рэктарата. Газеты, атрымаўшыя першынство ў двух турах агляду-конкурсу студэнцкага насценнага друку, узнагароджваюцца граматамі і пераходнымі прызамі.

Шырэй разгортвайце спаборніцтва за права ўдзелу ў конкурсе, за прызавыя месцы, змагайцеся за тое, каб наш друк заўсёды быў цікавым і дзейсным!

ЗА ЛЕПШЫ ВУЧЭБНЫ КОРПУС

Набліжаецца знамянальная дата ў жыцці беларускага народа. Рыхтуючыся да свята, тэхнічны персанал корпуса радыёфізікі і электронікі вырашыў разгарнуць спаборніцтва за лепшы вучэбны корпус і звяртаецца да студэнтаў, прафесарска-выкладчыцкага складу і ўсіх супрацоўнікаў факультэта з заклікам прымаць з свайго боку ўсе захады да таго, каб аўдыторыі, службовыя памяшканні заўсёды знаходзіліся ў чысціні, каб былі створаны належныя ўмовы для вучобы і арганізацыі навуковай працы.

Усім нам трэба звярнуць увагу на зберажэнне дзяржаўнай маёмасці, эканомію электраэнергіі.

У фізікаў ёсць усе падставы, магчымасці зрабіць свой корпус лепшым ва універсітэце.

А. ЛЯЛІНА, прафорг.
І. СТУКАЛА, Я. МАСКОЎСКАЯ, прыбіральшчыцы.

СТУДЭНТ І ЧАС

Пытанні арганізацыі вучобы, навуковай і грамадскай дзейнасці хвалююць студэнцтва і выкладчыкаў, кіраўнікоў партыйных арганізацый, камсамольскі і прафсаюзны актыў.

Мы лічым карыснай справай разгарнуць абмен думкамі па гэтых пытаннях, каштоўным вопытам, цікавымі прапановамі.

Пачынаюць размову тт. Салаў і Глушакова.

ВЫХАВАННЕ САМАСТОЙНАСЦІ

Партыйнае бюро і дэканат нашага факультэта заўсёды ўдзялялі вялікую ўвагу вучобе студэнтаў. Праўда, раней пытанне аб вучобе і самастойнай працы абмяжоўвалася крытыкай адстаючых, і не заставалася часу, каб больш пільна прыгледзецца да працы выдатнікаў. Цяпер мы вывучаем і распаўсюджваем іх вопыт з тым, каб рэзка павысіць якасць ведаў асноўнай масы студэнтаў, якая вызначае фізічны факультэт. Прымаем шэраг канкрэтных мер па павышэнню паспяховасці, якія ахопліваюць ўсе звенні грамадскіх арганізацый факультэта, і праводзім канкрэтную работу са студэнтам, групай, курсам.

Так, на прыйным сходзе фізфака са справаздачай аб самастойнай працы студэнтаў над вучэбным матэрыялам у час семестра выступалі сакратары камсамольскіх бюро другога і трэцяга курсаў Вечаслаў Махцюк і Эдуард Доўнар.

Аб выніках сваёй першай сесіі дакладвалі сходу сакратары камсамольскіх бюро Уладзімір Баклыкоў, Валерый Архіпенка, Аляксандр Жаланаў.

Праводзім дзелавыя нарады з кураторамі і выкладчыкамі, якія вядуць заняткі на курсе. Абмяркоўваем кожнага студэнта па-асобку, вызначаючы яго моцныя і слабыя бакі.

Нашы выкладчыкі шмат сіл удзяляюць рабоце са студэнтамі, знаходзяць у ёй вялікае задавальненне. Больш багатым духоўна становіцца студэнт ад гутаркі з такімі выкладчыкамі факультэта. Вось чаму так паважаюць на факультэце У. І. Вафіядзі, М. П. Халімановіча, А. Е. Левашова, Л. Е. Турэцкага, В. І. Кузьміча, Р. В. Плашчынскую, А. В. Шыбаеву, Н. А. Пракошыну, І. В. Якіменка.

Не ўсё, вядома, залежыць ад выкладчыка і студэнтаў. Так, напрыклад, у нашай бібліятэцы нельга дастаць многіх падручнікаў, дэканат і партбюро не вырашылі пытанне з радыёфікацыяй паточных аўдыторый, што адбіваецца на канспектаванні лекцый.

Але асноўныя веды студэнт усё ж атрымлівае шляхам самастойнай працы.

Глыбокі аналіз сведчыць аб тым, што ў многіх студэнцкіх групах самастойная работа вядзецца нездавальняюча. Лекцыйны матэрыял перапрацоўваецца ад выпадку да выпадку, адсутнічае сістэматызацыя вучэбнага матэрыялу; асноўнымі падручнікамі застаюцца канспекты. А калі яшчэ ўлічыць перагрузку, якая была выклікана сельскагаспадарчымі работамі на другіх-чацвёртых курсах, становяцца зразумелымі вынікі зімовай сесіі.

Асноўная маса студэнтаў фізфака — гэта тыя, хто любіць фізіку і матэматыку. Амаль усе медалісты. На адным толькі першым курсе 227 медалістаў. Але выдатна здалі сесію толькі 110 чалавек, 456 — добра і выдатна.

Няма патрэбы гаварыць аб самастойнай працы непаспяваючых студэнтаў: большасць з іх — гультаі. Імі яны сталі таму, што ў студэнцкіх групах не было кантролю і патрабаванняў да іх. А прапусціўшы два-тры дні, цяжка прымусіць сябе працаваць і пасля.

Адсутнасць маральнай адказнасці за расхлябанасць і тлумачыць, чаму ўчарашні медаліст не знайшоў сябе ў самастойнай працы.

Нас хвалюе тая акалічнасць, што зімовую сесію на «розную» тройку здалі 752 студэнты. А тройкі ёсць цвёрдыя і такія, якія пастаўлены не столькі за веды, колькі за адсутнасць іх. Слабыя тройкі небяспечны і іншым, Яны навязваюць стыль працы студэнцкаму калектыву: задаволенасць мінімумам, абыякавыя адносіны да ведаў, непатрабавальнасць да сябе і іншых, культывіруюць спажывецкія адносіны да жыцця. Вось. на наш погляд, чым можна растлумачыць затуханне інтарэсу да навукі з боку многіх студэнтаў на апошніх курсах.

Такія ж меры трэба прымаць, каб факультэт рабіў менш браку ў рабоце? З вопыту нашых выдатнікаў можна заключыць, што азначэннем іх самастойнай працы з'яўляецца распарадак дня.

Вось, напрыклад, распарадак дня студэнта другога курса.

Устаю ў 7^{20}—7^{40} гадзін кожны дзень, раблю зарадку. Снедаю.

ПАНЯДЗЕЛАК. Заняткі ва універсітэце да 14^{00}. 14—17^{00}— абед, чытанне лекцый, адпачынак 17^{00}—19^{30} і 20^{30}—22^{30} — самастойная праца. Астатні час чытаю, вячэраю.

АЎТОРАК. Да 15^{30} ва універсітэце. 15^{30}—18^{00} — абед, чытанне газет, часопісаў, 18^{00}—21^{00} — самастойная праца. 21^{00}—24^{00}— чытаю, гляджу тэлевізар, слухаю радыё.

СЕРАДА. Да 14^{00} ва універсітэце. 14^{00}—15^{30} — чытаю газеты, абедаю. 16^{00}—20^{00}—займаюся ў бібліятэцы. 20^{00}—23^{00}— займаюся дома.

ЧАЦВЕР. Да 16^{00} ва універсітэце. 14^{00}—16^{00} — абед, адпачынак, газеты. 19^{00}—23^{30}— займаюся.

ПЯТНІЦА. Да 14^{00} ва ўніверсітэце. 14^{00}—16^{00}— абедаю, чытаю. 16^{30}—19^{30}— займаюся ў бібліятэцы. 20^{30}—23^{30}—займаюся дома.

СУБОТА. Да 17^{00} ва ўніверсітэце. 19^{00}—21^{30}— займаюся.

НЯДЗЕЛЯ. Устаю у 10^{30}, займаюся з 14^{00} да 19^{00}. Лажуся спаць у 24^{00}.

Прыкладна столькі часу ўдзяляюць самастойнай рабоце Жэня Ціпкоў, Жэня Боўбель, Толя Чайкоўскі, Міша Батурыцкі, Барыс Нікоін, Лёня Мурын, Валодзя Баркоўскі, Юра Макараў, Юра Міхайлоўскі, Міхаіл Вішнеўскі, Гена Баранаў, Жора Рэчкалаў, Барыс Базылеў і іншыя.

Ёсць студэнты і з іншым распарадкам дня, які дапускае вольнае распараджэнне рабочым часам.

Вось адзін з прыкладаў.

ПАНЯДЗЕЛАК. Устаю, каб паспець на лекцыю. 10^{05}— іду ў кіно. Сёння мяняюцца фільмы. 14^{00}— канец заняткаў. 14^{00}—16^{00}—абед, чытаю газеты. 16^{00}—17^{30}—хацеў рашаць задачы, але задачніка не знайшоў. Разнервавауся. Гавораць, што ў «Партызане» цудоўны фільм. Імчу туды.

Няма патрэбы прыводзіць іншыя дні тыдня з такога «распарадку». Яны падобны адзін да другога. Няўменне арганізаваць свой працоўны дзень і прывяло да ліку адстаючых такіх студэнтаў, як Алемянкоў, Шабусаў, Новікаў, Пачыкоўскі, Ганчароў, Кудрына, Антонаў, Гаршкоў, Свінціцкі, Бутко, Камарова, Аванесян, Молчанаў, Чышрык, Баброві, Цвёрдамет, Смольскі, Чуйко, Каваленка, Мядзведзеў і іншыя.

Нашы камсоргі, прафоргі, старасты чамусьці недаацэньваюць выключна важную ролю строгай дысцыпліны ў стварэнні працоўных абставін у групе. А яны ж у першую чаргу адказваюць за гэтую дысцыпліну.

Ідзе другі семестр. Мы праверылі самастойную работу студэнтаў факультэта. За тры дні толькі ў чытальнай зале універсітэта сур'ёзна займаліся 56 студэнтаў трэцяга курса. Студэнты першага і другога курсаў раскачваліся.

Цяпер кафедры і грамадскія арганізацыі факультэта імкнуцца павысіць узровень навучальнага працэсу, удзяляюць вялікую ўвагу самастойнай працы студэнтаў.

Можна з упэўненасцю сказаць, што прынятыя меры дазволяць дасягнуць новых поспехаў у вучэбнай і навуковай працы.

П. САЛАЎ, сакратар партбюро фізічнага факультэта.

НАШ АКТЫЎ І ПАСІЎ

Ва універсітэце мы ў першую чаргу павінны авалодаць тым аб'ёмам ведаў, які прадугледжваецца праграмай. У гэтым сэнсе гісторыкам, калі браць на ўвагу вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі, можна пазайздросціць: яны выйшлі на адно з першых месц ва універсітэце. З 433 чалавек, якія здавалі экзамены, толькі 21 атрымаў нездавальняючыя адзнакі.

Камсамольскія бюро курсаў не стаялі ў баку ад пытанняў аб акадэмічнай паспяховасці і дысцыпліны камсамольцаў. Не прайшоў бясследна для студэнтаў удзел у адкрытым партыйным сходзе факультэта, дзе разглядаліся пытанні падрыхтоўкі да экзаменацыйнай сесіі.

Але строгі кантроль за паспяховасцю патрэбна сумяшчаць са стварэннем творчых абставін, рамантыкай пошукаў і адкрыццяў. Напэўна, троечнікі будуць існаваць да той пары, пакуль студэнты будуць адчуваць сябе толькі студэнтамі, а не гісторыкамі.

Наш факультэт не стаяў у баку ад навуковых аглядаў, конкурсаў і канферэнцый. Студэнты-гісторыкі падалі больш 40 прац на І Усесаюзны агляд па праблемах грамадскіх навук, гісторыі камсамола і міжнароднага маладзёжнага руху, на ІІ Усесаюзны агляд факультэт рыхтуе больш 50 студэнцкіх работ.

І ўсё ж арганізацыя навуковай студэнцкай працы застаецца не зусім здавальняючай.

Ёсць справы, за выкананне якіх не ставяць адзнак у заліковыя кніжкі ці дыпломы, але якія ў значнай ступені характарызуюць студэнта. Гэта грамадская работа. Яна фармуе цвёрдасць перакананняў, навыкі прапагандыста і агітатара, уменне працаваць з людзьмі. І тут паўстае пытанне: ці заўсёды мы прыцягваем студэнта да грамадскай работы калектыва?

Студэнты-гісторыкі ў першым семестры прынялі ўдзел у многіх масавых мерапрыемствах факультэта і універсітэта. Разам са студэнтамі іншых факультэтаў насыпалі Курган Славы. Прынялі самы актыўны ўдзел у арганізацыі мітынга, прысвечанага дню нараджэння камсамола; напярэдадні 50-годдзя Кастрычніка сустракаліся з Героямі Савецкага Саюза Ветравым і Марозавым; прынялі ўдзел у многіх экскурсіях па гісторыка-рэвалюцыйным месцам сталіцы; з цікавасцю слухалі лекцыі «Аб дэвальвацыі фунта стэрлінгаў», «Аб будучым горада Мінска» і г. д. Гэта толькі частка ўсіх масавых мерапрыемстваў, не улічваючы вечароў, спартыўных мерапрыемстваў, камсамольскіх канферэнцый.

Але атрымліваецца так, што мы часта захапляемся такімі масавымі мерапрыемствамі, забываючы, што вялікая частка іх удзельнікаў застаецца толькі пасіўнымі гледачамі... Каб дайсці да кожнага, неабходна ўключыць яго ў актыўную грамадскую працу.

Было б нядрэнна прачытаць на старонках нашай газеты аб тым, як вырашаюць гэтыя праблемы камсамольскія арганізацыі іншых факультэтаў нашага універсітэта.

Т. ГЛУШАКОВА,
сакратар камітэта камсамола гістфака.

У фанетычным кабінеце.

Фота Я. ДАНІЛАВА.

КРОЧЫЦЬ ДРУГІ СЕМЕСТР

На практычных занятках па фізіцы.

На падрыхтоўчым факультэце ідзе другі семестр. Здаецца, нічога асаблівага — як і ў першым семестры замежныя студэнты кожны ранак запаўняюць аўдыторыі, і пачынаецца звычайны працоўны дзень: там выконваюць лабараторныя заданні па фізіцы; тут заняткі па чарчэнню праводзіць Уладзімір Аляксеевіч Мельнікаў, а вось гэтыя дзве групы ў фанетычным кабінеце апрацоўваюць рускае вымаўленне.

Звычайнае студэнцкае жыццё, нічога асаблівага! Але гэта толькі здаецца. Асаблівага і незвычайнага шмат. Проста мы яго не заўважаем, бо звыкліся з ім. А варта азірнуцца назад. За кароткі час пройдзен такі вялікі шлях! Здаецца, учора яшчэ гэтыя хлапчукі і дзяўчынкі, што прыехалі з братняга В'етнама, не маглі ў гутарцы з намі абыйсціся без перакладчыка, многія з іх не ведалі ніводнага рускага слова. А сёння яны выступаюць на вечарах і мітынгах з прамовамі, пішуць заметкі на рускай мове ў факультэцкую насценную газету «Дружба», спяваюць песні і чытаюць вершы савецкіх аўтараў. Сёння на кожнае пытанне па фізіцы, хіміі і матэматыцы могуць адказаць на рускай мове і ад гэтага, нават, заняткі пачалі праходзіць весялей, больш энергічна.

Як сведчанне таму — семінарскія заняткі па курсу «Савецкі Саюз», якія праводзіць зараз на падрыхтоўчым факультэце дэкан факультэта, кандыдат эканамічных навук Міхаіл Кірылавіч Гарбачоў.

Мы наведалі нядаўна семінар па тэме: «Перамога Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі».

— Слухайце першае пытанне, — звяртаецца да аўдыторыі Міхаіл Кірылавіч.— Расказаць аб перарастанні буржуазна - дэмакратычнай рэвалюцыі ў сацыялістычную.

І адразу ўзнімаецца лес рук. Каму ж прадаставіць слова? Але студэнты ,каб захаваць для пачатку субардынацыю, аддаюць яго намесніку прэзідэнта зямляцтва Дзін Ван Тхонг.

Тхонг, здаецца, даў вычарпальны адказ. Аднак, падымаецца Ле Дык Зы, які развівае думкі Тхонга, дэталізуе асобныя моманты яго адказа на пастаўленае пытанне. Ле Дык Зы падрабязна перадае змест «Красавіцкіх тэзісаў» У. І. Леніна і затым расказвае сваім сябрам аб падрыхтоўцы і перамозе ўзброенага паўстання ў Петраградзе.

На рабоце ІІ Усесаюзнага з'езда Саветаў і значэнні прынятых ім рашэнняў спыніўся Чан Дам Хан. Адказы сваіх таварышаў дапаўняюць іншыя студэнты.

Цікавым было выступленне Нгуен Дык Хіена. Расказваючы аб прычынах перамогі і сусветна-гістарычным значэнні Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, ён падрабязна спыніўся на тым, які ўплыў аказала яна на нацыянальна - вызваленчы рух і рэвалюцыйную барацьбу народных мас у В'етнаме.

Міхаіл Кірылавіч Гарбачоў задаволены: семінар прайшоў на высокім узроўні, пры высокай актыўнасці яго ўдзельнікаў, а галоўнае, яго радуе, што дзеці братняга гераічнага народа праяўляюць вялікую цікавасць да гісторыі барацьбы нашага народа за сваё светлае будучае. Яны з гонарам вывучаюць вопыт гэтай барацьбы, каб быць не толькі спецыялістамі, але і актыўнымі ўдзельнікамі грамадска-палітычнага жыцця сваёй краіны, будаваць разам са сваім народам сацыялізм, а затым і камунізм. Гэтым хлапчукам і дзяўчынкам з далёкага В'етнама належыць будучае іх народа, які сёння гераічна змагаецца супраць амерыканскіх імперыялістаў.

Ул. ГАЛАЙША.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ЭСТАФЕТА ВЕРНАСЦІ

(«Традыцыйны збор» В. Розава ў тэатры імя Я. Купалы)

...Гучыць школьны вальс. За партамі выпускнікі сарокавых гадоў. Не ўсе прыйшлі сюды. Многія не вярнуліся з франтоў Айчыннай вайны.

...Успаміны, жарты. А за ўсім гэтым адчуваеш, як набліжаецца сур'ёзная размова.

Прысутных непакоіць жыццёвы шлях сяброў, станаўленне чалавечай асобы.

Перад гледачамі паўстае панарама жыцця трох пакаленняў: ад хлапчукоў нябачанай рэвалюцыі да маладога сучасніка нашага часу.

Ад бацькоў у спадчыну дзеці атрымалі сумленне, пачуццё грамадскай адказнасці, унутранае духоўнае багацце. Адзінства бацькоў і дзяцей, эстафета вернасці ідэям камунізма — вось эпіграф да п'есы В. Розава «Традыцыйны збор».

Сваёй вострай публіцыстычнай тэматыкай і грамадзянскім гучаннем спектакль абвяргае міф буржуазных ідэолагаў аб «канфлікце пакаленняў».

Спектакль удаўся. І сакрэт гэтай удачы ў тым, што кожны знаходзіць у ім нешта для сябе, заўважае тое, што раней не прыцягвала ўвагі.

Радуе творчы кантакт моладзі і старэйшага пакалення актораў тэатра. Хвалюе ігра М. Федароўскага, Т. Аляксеевай, В. Тарасава, Р. Філіпава, П. Кармуніна і іншых.

Глыбокі псіхалагізм асобных карцін, вобразная і пластычная форма спектакля гавораць аб таленавітасці маладога рэжысёра-пастаноўшчыка спектакля Б. Луцэнкі.

Удалыя рэжысёрскія знаходкі — зямны шар з паралелямі і мерыдыянамі чалавечага лёсу; увасабленне чалавечага жыцця ў дрыготкіх агеньчыках, успыхваючых то там то тут на планеце — даносяць да гледача думку аўтара і ўсяго творчага калектыва: чалавеку дадзена жыццё. Гэта цудоўна і непаўторна. Ад чалавека залежыць — гарэць агеньчыку жыцця, ці тлець...

Н. ЛІСОЎСКАЯ.

У СВЕЦЕ ТАНЦА

З ансамблем Маісеева мы пазнаёміліся ў фільме «За рампай — Амерыка». Усе, вядома, памятаюць узбуджаныя твары амерыканскіх гледачоў, іх крыкі «брава», усхваляваных ад поспеху артыстаў ансамбля народнага танца СССР і лаўрэата Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій Ігара Маісеева.

А нядаўна мы мелі магчымасць пазнаёміцца з праслаўленым ансамблем бліжэй у час яго гастроляў у Мінску. Праграму назвалі «Дарога да танца». Чаму?

Ансамбль імкнуўся паказаць, што бліскучае майстэрства дасягаецца нялёгкай, упартай працай.

Танец, як твор мастацтва, нараджаецца паступова: заняткі каля станка, апрацоўка асобных рухаў, элементаў, пасля невялічкія замалёўкі і, нарэшце,—увесь танец, шырокае палатно, поўнае выразнасці, думкі, цудоўнага гумару.

Танцоўшчык, перш чым стаць сапраўдным майстрам, павінен выпрацаваць у сябе не толькі віртуозную тэхніку. Яму патрабуецца яшчэ сіла, стойкасць і вынослівасць акрабата, тонкі музыкальны слых, уменне іграць на музычных інструментах.

У праграме, якую прывезлі нам маісееўцы, мы ўбачылі, як з простых практыкаванняў, звычайных элементаў нараджаецца сакавіты, яркі танец, прэдзельна выразны і эмацыянальны. Мы ўбачылі ў праграме цэлую галерэю народных танцаў: грузінскія і італьянскія, украінскія і балгарскія, аргенцінскія і малдаўскія. Мы ўбачылі і эцюды, і вялікія харэаграфічныя кампазіцыі.

Хочацца сказаць некалькі слоў аб касцюмах. У іх—рэдкія спалучэнні фарбаў, прытым настолькі нечаканыя і кантрасныя, што спачатку і не зразумець, ці гэта прырода стварыла іх, ці наша ўяўленне.

Усе танцы ансамбля незвычайны. Нельга абыякава глядзець на «Гарадскую кадрыль» з цыкла танцаў «Карцінкі мінулага». Гумар у спалучэнні з бясспрэчным майстэрствам і артыстычнасцю ствараюць камічную замалёўку жыцця правінцыяльнага гарадка. Апладысментамі сустрэлі гледачы і «Аргенцінскае танга» ў выкананні О. Маісеевай і М. Аляксандрава.

Мастацтва ансамбля настолькі самабытнае, што яго ніяк нельга не адрозніць ад якога-небудзь іншага. Паказаны маісееўцамі складаны працэс стварэння танца прыадкрыў занавес над сакрэтамі танцавальнага мастацтва.

Цяпер аб ансамблі знят фільм, які назвалі «Вечны рух». Вечны рух да майстэрства, да новых вобразаў, да новых поспехаў, да новага ўдзячнага гледача.

Н. ЦІМАФЕЕВА,
Л. ШАПІРА,
студэнткі
І курса журфака.

У АБ'ЕКТЫВЕ — ПРЫРОДА

Той, каму даводзілася праходзіць па калідоры другога паверха гуманітарнага корпуса, дзе вісіць насценная газета журфака, не мог не спыніцца перад здымкамі, якія выкананы студэнтам трэцяга курса С. Супруком. Малады, але даволі вопытны аматар фатаграфіі аддае любімай справе большую частку свайго вольнага часу. Тонкае адчуванне жывой прыроды, уменне заўважаць найбольш характэрнае, чысціня і дакладнасць работы — вось што адрозніває С. Супруна ад іншых фотааматараў. Дарэчы, аб яго майстэрстве вы можаце судзіць самі, разгледзеўшы хоць бы вось гэтыя здымкі.

З трыбуны «Маладосці»

«Маладосць», на мой погляд, адзін з тых часопісаў, што добрасумленна спрыяе пачынаючым. Толькі ў мінулым годзе на яго старонках былі надрукаваны вершы У. Дзюбы, І. Паўлава, В. Зуёнка, У. Мархаля, апавяданні І. Кірэйчыка, В. Санько, М. Капыловіча, М. Гіля, Н. Маеўскай, В. Макарэвіча і многіх іншых. Няма сэнсу ўсіх успамінаць — адно вядома: усе яны ў мінулым (а некаторыя і цяпер яшчэ студэнты) навучэнцы Беларускага універсітэта.

У дзевятым нумары «Маладосці» за мінулы год змешчаны адразу чатыры апавяданні нашых калег.

Ад першай асобы вядзе расказ Алесь Масарэнка ў апавяданні «Юлька, якая ты?» Гэта невялікі твор аб сабе, успаміны дзяцінства. Прачытаўшы «Юльку», адчуваеш подых беларускай прыроды: «Вялікае барвовае сонца паволі асядала за лес, а ў небе пульхна-шэрыя хмурынкі спяшаліся далучыцца да калматага воблака з чорнай плямай пасярэдзіне. Бралася ,як мне здалося, на дождж з навальніцай. Я нават на імгненне ўявіў сабе: ляжу на ложку з заплюшчанымі вачыма — так часта рабіў у маленстве — і слухаю, як пагрозліва грукоча гром.

— Не глядзі, дажджу не будзе,— разгадаў мае думкі Марка і ўзяўся набіваць зялёна-жоўтым самасадам зашмальцаваную, з кароткім цыбуком люльку. І толькі пасля, калі запаліў яе, дадаў:

— Бачыш, захад чысты, ды і расяна ўжо...— зацягнуўся і, трохі счакаўшы, выдыхнуў клубок густога шызага дыму».

Апавяданне А. Масарэнкі не з тых, што выклікае мноства роздумаў, прымушае шукаць адказаў. Гэта просты лірычны ўспамін.

Падобнае па сваёй сюжэтнасці і апавяданне Алеся Жука «Сок Манга». У ім аўтар паспрабаваў раскрыць душу любячай дзяўчыны.

Апавяданне, у адрозненне ад іншых, значна перасыпана дыялогамі, і гэта толькі лепш падкрэслівае і вырысоўвае характары герояў.

У апавяданні М. Зыля «Непакорлівы» мы нечакана сустракаемся не з чалавекам-героем, а з птушкай («Непакорлівы» — імя голуба). Але гэта толькі па загалоўку так, на самай жа справе ў апавяданні ў цэнтры ўвагі — бацька вялікай вясковай сям'і, суровы і цвёрды, «не любіўшы чужых парад і навучання».

Аўтару апавядання блізкая вёска, вясковае жыццё, родная мова; верыш, што ён папрацаваў над творам, у якім карціна жыцця сям'і вяскоўца-няўдачніка вырысавана праўдзіва, непрыкрашана.

На мой погляд, аўтарам пералічаных апавяданняў удаліся літаратурныя вобразы. Добрая мова дзеючых асоб, ёсць і свае асаблівасці ў выкарыстанні мастацкіх сродкаў.

Па-рознаму сказалі аб сабе аўтары апавяданняў, па-рознаму ўспрымаюцца спробы пяра пачынаючых празаікаў, але спадабаліся ўсе за прастату і непадкупнасць.

В. ШАРЭПА,
студэнт.



НА ЗДЫМКАХ (ЗВЕРХУ ЎНІЗ): ПЕРШЫ ПОЗІРК. ЛАКОМКА. ЛЯСНЫ ФРАНТ.

ПЯЮЧЫЯ ГІТАРЫ

Кожнае выступленне артыстаў вызначаецца, у першую чаргу, зацікаўленасцю. А зацікаўленасць гледачоў вызначаецца недахопам білетаў. Так было і на гэты раз, калі перад студэнтамі нашага універсітэта выступілі артысты Ленінградскага эстраднага вакальна-інструментальнага ансамбля «Пяючыя гітары».

Іх, артыстаў, было нямнога. Усе адразу выйшлі на сцэну. Патухла святло. Запаліліся разнакаляровыя ліхтары, і... музыка, зусім не падобная на гучанне звычайных гітар, запаўняе залу... Гукі патанаюць у гуле шчырых апладысментаў...

Прысутныя былі ўражаны арыгінальным выкананнем вядомых народных і сучасных песень «Полюшка-поле», «Балада пра бацьку», цыганскіх рамансаў і мелодыямі замежных кампазітараў.

Пасля канцэрта студэнты хімічнага факультэта ўзялі аўтографы ў ленінградскіх артыстаў, у якіх выказваліся найлепшыя пажаданні ў сувязі са святам 8 Сакавіка.

А. САГАЎ.

УНІВЕРСІТЭЦКІМ ЖАНЧЫНАМ

(ВЯСЁЛАЕ ПАСЛАННЕ З ВЫПАДКУ СВЯТА)

Жанчынам універсітэта—
Хвала, пашана і паклон,
Каб красавалі з лета ў лета —
Без ліку год, без ліку дзён!

Хачу, хоць можа хто й нязгодны,
Спытаць усю тут грамаду:
На кім трымаецца наш родны
Ардэнаносны БДУ?

Адказ не будзе галаслоўным
І не пакрыўдзіць ён мужчын,
Калі сказаць, што у асноўным
На моцнай армії жанчын.

Не буду лічбамі вас мучыць,
Але прыкіньце: колькі іх,
Што і выхоўваюць, і вучаць,
І пішуць горы мудрых кніг!

Яны—выкладчыкі, дацэнты,
Прафесары і асістэнты,
І дактары і кандыдаты,
І проста мілыя дзяўчаты,
Што аспіранткамі завуцца
І пакрысе ў навуку рвуцца!

А паглядзі на факультэтах
Арганізацый розных склад:
Ва ўсіх бюро і камітэтах
Работа ў іх ідзе на лад.

Каму, напрыклад, невядома,
Што без жаночага звяна
Усёй бы дзейнасці мясцкома
Была б, як кажуць, грош цана.

Прызнацца нават не збаюся:
Калі б не дружны іх актыў,
То пэўна ў нашым прафсаюзе
Я б і дасюль яшчэ не быў.

Ды што мясцком! Калі ўжо шчыра
Цаніць службовы апарат —
То каб не мудрыя жанчыны,
Чаго б быў варты рэктарат?

Адзін знаёмы з факультэта
Мне прызнаваўся па сакрэту:
— Такія, брат, жанкі ў прыёмнай,
Што як на споведзі скажу:
Я перад рэктарам так дробна,
Як перад імі, не дрыжу!..

Ці, скажам, вось — бібліятэка:
Ад заснавання БДУ —
Амаль што цэлага паўвека —
Яна ва ўсіх нас на віду.
Усім расці нам памагала
І ўсім дарадчыцай была,
Калі з студэнцкай люднай залы
У навуковую вяла.

Як шмат асоб за час за гэты
Тут набылі вучоны чын!
(А што між іх ёсць пустацветы—
Бібліятэка ні прычым).

Хвала цішы яе рабочай,
Хвала жанчынам, без якіх
Уся навука і вучоба
Затармазілася б у міг!

А ў бухгалтэрыю зайдзіце,
У генеральны гэты штаб:
Паназірайце, паглядзіце...
Не, там не ўбачыце вы баб!
Там і направа і налева—
Хоць ты малюй партрэт з любой:
Як ёсць фінансаў каралева
Сядзіць на троне прад табой!

Я нават думаю, між іншым,
Калі ад сэрца іх хвалю,
Што ў акружэнні гэткім, пышным

Зусім не блага й каралю!
А як людзей яны прымаюць,
Тлумачаць, лічаць і звяраюць—
Ну, так культурна, так карэктна,
Аж не нацешыцца прарэктар!

Калі ж ты ў іх адхопіш грошы,
То ўжо такі настрой харошы,
Што хоць у горле і не смагне —
Ураз на чарачку пацягне!

Прайдзіце сто лабараторый
І паглядзіце на дзяўчат:
Калі і ссох душой каторы—
Дык там закруціцца, як гад!

І з кабінетаў лабарантак
Было б бязбожна не цаніць—
Добрасумленных, акуратных
І паслухмяных працаўніц.

О, як на іх «самаахвярна»
Нагрузкі любім мы ўскладаць!
Як давяраем рэгулярна
Узносы ўсякія збіраць!

Адчыніш дзверы канцылярый—
І там жанкі, як макаў цвет,
Ды не засушаны гербарый,
А свежы, ранішні букет!

А пасядзі ў аддзеле кадраў,
Пакуль даведку выдаюць:
Ну, так гавораць далікатна—
Нібы мядок на сэрца льюць!

Сёй-той бурчыць, што за нагрузку
Яго Кузьмінічна трасе.
Скажу такім па-беларуску:
І не чакайце, братцы, спуску!
Яна на службе, як і ўсе,
І вельмі добра, што трасе!

Не патрасі ў пару другога,
Дык ён і вочы не пратрэ,
І сам забудзецца, нябога,
За што зарплату ён бярэ!

Ну, а вазьміце прыбіральшчыц,
Ці гардэробшчыц, ці вахцёрш—
Без іх сумленнай, шчырай працы
Было б усім намнога горш,

Бо зараслі б гразёй і смеццем
І новы корпус і стары,
Было б на кожным факультэце,
Як на заезджым дзе двары.

Яшчэ з пашанаю вялікай
Хачу сказаць пра тых жанчын,
Што хоць у нас і не на ўліку—
Без іх былі б мы ўсе ні з чым.

Кажу пра добрых жонак мілых,
Чые шаноўныя мужы
Заўзята цягнуць, колькі сілы,
За навуковыя гужы.
Іх мірны подзвіг проста рэдкі:
Свая работа ў многіх ёсць,
А дома муж, а дома дзеткі,
А ў мужа часам сябраго сць.

Не так і соладка штодзённа
Глытаць кухонны чадны дух,
Пакуль натхнёна дзесь і плённа
Навуку рухае супруг.

Аднак пара канчаць пасланне,
Пара, устаўшы з-за стала,
Сказаць ізноў на развітанне:
Жанчынам — слава і хвала!

І вы прыміце слова гэта,
Як ад усіх мужчын паклон,
Каб красавалі з лета ў лета—
Без ліку год, без ліку дзён!

Ніл ГІЛЕВІЧ.

РАЗВІТАННЕ З ЗІМОЙ. Фота У. Філатава.

Эстэтыка, этыка і мы

Спачатку прыклады. Прыклад першы: студэнт-дзяцюк (не дацягнешся да чупрана!). У зубах цыгарка — і ...размаўляе з дзяўчынай!

Прыклад другі. Вечар, якіх шмат праводзіцца ва універсітэце, дзе ў праграму абавязкова ўваходзяць танцы. Зайграла музыка. Дзяцюк (той ці іншы — не ў гэтым справа!) да дзяўчыны: «Хадзем, цыпачка, збацаем!»— і пацягнуў нібы якую рэч.

Прыклад трэці. Аўдыторыя раніцай — чысціня ўсюды. Тая ж аўдыторыя пасля заняткаў— пад сталамі кучы смецця. Нават брыдка глядзець.

Прыклад чацвёрты. Дыялог:

— «Вайну і мір» глядзеў!

— Фі! Знайшоў аб чым гаварыць.

— «Анну Карэніну»!

— Фі!..

— А што ж ты глядзеў у апошні час!

— Што! Пачакай... пачакай... як жа ён называецца! Той што...ну...

Прыклад пяты. А мо хопіць! Падобнае ў нашым жыцці, хоць і не часта, але можна сустрэць. Менавіта таму, відаць, эстэтычнаму і этычнаму выхаванню студэнтаў быў прысвечаны адкрыты партыйны сход філалагічнага факультэта. Я напісаў — «сход», але гэта не зусім дакладна. Хутчэй за ўсё — ішла шчырая, непасрэдная размова аб тым, якім павінен быць сапраўдны савецкі студэнт.

Заслугоўвае ўвагі сама падрыхтоўка і правядзенне гэтага мерапрыемства.

На пасяджэнні партыйнага бюро вырашылі: традыцыйнага даклада не будзе. Правядзем анкету сярод студэнтаў, куды ўвойдуць некалькі пытанняў — эстэтычнага і этычнага характару, а вынікі паведамім удзельнікам схода. Вось, калі ласка, вам жыццёвыя прыклады — і давайце разам вырашым, што нам рабіць.

Ужо той факт, што ў ажыўленых спрэчках выступіла 13 чалавек, сведчыць: пастаўлена жыццёвае пытанне, а форма правядзення падобных сходаў поўнасцю апраўдала сябе.

Т. ПАЎЛАЎ.

СЛЯПЫ СТУДЭНТ

У час экзаменацыйнай сесіі многія студэнты скардзіліся, што яны вельмі перагружаны працай, што наогул ад іх патрабуюць нездзейснага. Вось і ў рэдакцыі днямі ў мяне адбылася гутарка з такім «пакрыўджаным» студэнтам. Пры гэтым я расказаў яму аб незвычайным лёсе і, не перабольшваючы, фантастычным жыцці сляпога студэнта. Думаю, што гэты расказ зацікавіць нашых чытачоў, і яны напішуць аб сваіх сябрах, якія, пераадольваючы вялікія цяжкасці, няспынна ідуць да сваёй мэты.

На магілках вёскі Абухаўка, недалёка ад Белгарада, ля старой бярозы стаіць пахілены крыж. На ім ледзь прыкметныя выпаленыя літары. Надпіс сведчыць, што тут пахаваны «сінявокі паэт, музыкант, настаўнік і ўрач Васіль Ерашэнка». Прыйдзе час, і на гэтым месцы будзе ўзведзены помнік Мужнасці, бо памяць аб Васілю Ерашэнку павінна жыць вечна. Журналісты Масквы, Ташкента па крупінках збіраюць усё, што датычыцца яго незвычайнай біяграфіі. І хоць пакуль вядома не так многа, ужо дзесяткі юнакоў і дзяўчат вучацца ў Ерашэнкі мужнасці, працаздольнасці...

У вёсцы Абухаўка не было такога шустрага і надзвычай дапытлівага хлапчука як Васілёк. Бацька не мог нацешыцца сваім сінявокім прыгажуном і часта разводзіў рукамі, калі сын задаваў яму пытанні. Ён цікавіўся ўсім — і чаму бярозы белыя, і чаму вясковы поп паслаў свайго сына вучыцца ў Кіеў, а дзеці сялян не ўмеюць чытаць... Ерашэнка не раз задумваўся аб тым, каб пайсці да «бацюшкі» і папрасіць яго навучыць Васілька грамаце.

Але планы бацькі рухнулі. Васілёк прастудзіўся і цяжка захварэў. Не дапамаглі ні зёлкі знахароў, ні парады старых. Вось тады і вырашыла бабка аднесці ўнучка ў царкву і акунуць у купель — мо, бог злітуецца. Здарылася непапраўнае: пасля царкоўнай працадуры Васілёк аслеп.

Бацька пазычыў грошай і павёз хлапчука да ўрачоў у Маскву. Там сказалі: позна. Так і застаўся сінявокі Васілёк сляпым.

Гора за год састарыла Ерашэнку, а Васілёк быццам не адчуваў свайго няшчасця. Ён па-ранейшаму гуляў з дзецьмі і навучыўся так арыентавацца, так адчуваць перашкоды, што адзін хадзіў у лес. Неяк у вёску прыехаў студэнт-семінарыст і быў здзіўлены незвычайнымі здольнасцямі сляпога хлапчука. Ён і ўгаварыў Ерашэнку аддаць сына ў спецыяльную маскоўскую школу.

У Маскве Васіль хутка засвоіў азбуку для сляпых, перачытаў усе кніжкі, якія знаходзіліся ў школе. Да яго часта звярталіся сябры з просьбай прачытаць што-небудзь новае. Але новага не было. Тады Ерашэнка пачаў складаць свае апавяданні, пісаць вершы. Ніхто не верыў, што гэта яго творы. Зрэшты, Васілёк і не настойваў на сваім аўтарстве. У яго не хапала часу на спрэчкі. У хлопчыка быў абсалютны слых і ён старанна вучыўся іграць на скрыпцы, на гітары. Пасля заканчэння школы Васіля прынялі салістам у аркестр рэстарана «Якар».

Паслухаць ігру сляпога музыканта прыходзілі маскоўскія знамянітасці, яму прапаноўвалі лепшыя месцы. Ерашэнка не згаджаўся, ён марыў аб далейшай вучобе. Але як, дзе?

Аднойчы Васіля пазнаёмілі з настаўніцай замежных моў, якая вельмі часта прыходзіла ў рэстаран паслухаць маладога скрыпача. Яны пазнаёміліся і пасябравалі. Ад яе Ерашэнка даведаўся, што ў Лондане ёсць вышэйшая навучальная ўстанова для сляпых. Думаць аб ёй дарэмна: патрэбны веданне англійскай мовы, грошы, нават праважаты.

Васіль не думаў. Ён дзейнічаў. Спачатку стаў шукаць падручнікі для сляпых па вывучэнню замежных моў. Іх не аказалася. Звярнуўся да педагогаў, тыя сказалі, што вывучыць чужую мову толькі па слыху можна праз тры-пяць год. Ён чакаць не мог.

Выручыў плямяннік настаўніцы, з якой ён пазнаёміўся ў рэстаране. Пятнацацігадовы юнак прапанаваў Ерашэнку вывучаць эсперанта, поспех гарантаваў праз пяць-шэсць месяцаў. Васіль засвоіў гэтую мову за два месяцы.

А тым часам з Каралеўскай школы прыйшла згода, а хутка — і віза.

Сябры сабралі грошай, але калі падлічылі, то аказалася, што іх хопіць толькі на адзін білет. Ерашэнка вырашыў ехаць без праважатага. Якое яго было здзіўленне, калі ў Брэсце яго прыйшлі сустракаць мясцовыя жыхары. Яны паклапаціліся аб усім. Мабыць хтосьці напісаў аб Ерашэнку, і невядомыя сябры — беларусы дапамаглі яму перасесьці ў другі поезд. Гэта было ў 1910 годзе.

І вось Лондан. Гады вучобы праляцелі хутка. Ерашэнка не толькі паспяхова скончыў вышэйшую навучальную ўстанову, выдатна авалодаў англійскай мовай, але і здзівіў лонданцаў цудоўнымі вершамі, песнямі. Ён па-ранейшаму захапляўся музыкай, прыгожа танцаваў. Сваім прыкладам Васіль прымусіў кіраўнікоў Каралеўскай школы ўвесці ў курс навучання для сляпых гімнастыку, ігры, танцы, урокі свабоднага арыентавання. Рускім цудам назвалі яго англічане.

А Ерашэнка зноў незадаволены. Яго вабяць далёкія краіны. Спачатку Васіль едзе ў Парыж, слухае лекцыі ў Сарбоне, авалодвае французскай мовай і на гэтай мове выдае свой першы зборнік вершаў.

Ганарар даў магчымасць ехаць далей. Ерашэнка — у Японіі. Здзіўляе яго здольнасць адначасова займацца многім. У Токіо Ерашэнка дасканала вывучае японскую літаратуру, мастацтва, філасофію, выкладае ў школе для сляпых.

Прайшло паўтара года. У японскіх газетах і часопісах адзін за адным з'яўляюцца вершы, навэлы пісьменніка Ерашэнкі. Чытача здзіўляюць і імя іх аўтара і творы. Хутка Васіль становіцца адным з самых папулярных пісьменнікаў імперыі ўзыходзячага сонца, а пазней ён прызнаецца класікам Японскай паэзіі.

Праз некалькі год імя Ерашэнкі ўспыхвае ў Сіаме, Індыі, затым у Кітаі. У Кітаі Васіль жыве ў пісьменніка Лу Сіня. Лу Сінь вельмі любіў Ерашэнку, схіляўся перад ім як паэтам і чалавекам, лічыў яго жыццё подзвігам. Кітайскі пісьменнік прысвяціў Васілю адну з сваіх лепшых навэл.

І зноў Сіам. Тут Ерашэнка застае вестка аб рэвалюцыі. Яму 27 год, ён поўны сіл, вялікіх творчых планаў, ён імкнецца на Радзіму. Паэт вырашае ісці дамоў пяшком — праз Індыю, Афганістан, Сяроднюю Азію. Задумана — зроблена. Але ў Індыі яго арыштавалі англічане. Для іх ён «бальшавіцкі агент». Памочнікі белагвардзейцаў, яны рашылі адправіць Ерашэнку ва Уладзівасток, каб учыніць над ім суд.

...Калі Васіль Ерашэнка стаў студэнтам Каралеўскай школы, яму было дваццаць гадоў. Але якія цяжкасці стаялі перад ім! Ён іх пераадолеў, прайшоў праз многія перашкоды, а на працягу наступных шасці — сямі год стаў вядомым нацыянальным пісьменнікам Японіі, Індыі, Кітая...

М. РЭГІСТАНАЎ.

Рэктарат, партком і мясцком універсітэта выказваюць глыбокае спачуванне дэкану факультэта журналістыкі дацэнту Рыгору Васільевічу Булацкаму з выпадку напаткаўшага яго гора— смерці бацькі.

Партыйнаае бюро, камітэт камсамола і прафсаюзная арганізацыя факультэта журналістыкі выказваюць глыбокае спачуванне дэкану факультэта дацэнту Рыгору Васільевічу Булацкаму з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці бацькі.

Калектыў бібліятэкі БДУ выказвае глыбокае спачуванне старшаму бібліятэкару Валянціне Уладзіміраўне Цельпуговай-Мякота з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці маці.

Адказны рэдактар
М. ІОСЬКА.

АТ 02117 Зак. № 458. Наш адрас: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».